26.10.2020 / 22:02

У Слуцку масава судзілі тых, хто ўскладаў кветкі да помніка ахвярам Халакоста



Людзей, якія прыйшлі на суд слухачамі, не пусцілі. Фота: Алеся Белая.

У сераду 21 кастрычніка крыху больш за 10 жыхароў Слуцка ўсклалі кветкі да помніка спаленым і забітым вязням слуцкага гета. Пазней затрымалі некаторых з іх. 26 кастрычніка над гараджанамі прайшлі першыя суды, піша Інфа-Кур'ер.

26 кастрычніка суды прайшлі над Андрэем Кратом, Ірынай Крот, Зінаідай Цімошак і Яўгенам Азёрным. Іх абвінавачвалі па артыкуле 23.34 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі або

правядзення масавых мерапрыемстваў). Усе пасяджэнні вёў суддзя Аляксандр Шутко. Суд прызначыў:

- Андрэю Крату — штраф 30 базавых велічынь (810 рублёў),
- Ірыне Крот — штраф 20 базавых велічынь (540 рублёў),
- Зінаідзе Цімошак — штраф 40 базавых велічынь (1080 руб),
- Яўгену Азёрнаму — 10 сутак арышту.

Яшчэ дваіх затрыманых будуць судзіць заўтра.

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

У Докшыцах зноў хапун за «экстрэмісцкія матэрыялы»

Мінабароны добраўпарадкавала пляцоўкі пад ракеты «Топаль» 2

Зелянкоўская — драма з Міхалком, «Анастасія Слуцкая», Тарзан і сустрэча з Лукашэнкам 4

«Маё жыццё — таксама суцэльныя кампрамісы». Канстанцін Каверын — пра бяссілле, БАТЭ і свой спосаб не ўпасці ў дэпрэсію